Очнувшись в Сан-Франциско в госпитале, герой узнал о древней филистимской легенде о Дагоне и осознал, что где-то в глубине вод таятся мерзкие твари, которые рано или поздно уничтожат человечество.

Читатель сам определяет, была рассказанная история следствием воздействия морфия, сном или действительностью. И в этом одна из особенностей произведений Г. Ф. Лавкрафта – он не стремится вернуть читателя в состояние привычного равновесия, предлагая ему благополучную, реалистичную развязку сверхъестественных событий.

Таким образом, художественное наследие Г. Ф. Лавкрафта оказало существенное влияние на становление литературного канона XIX – начала XX столетий. Его творчество продолжает традиции готического повествования. Отсутствие стереотипов, психоаналитические и психологические особенности содержания рассказов Г. Ф. Лавкрафта возбуждают интерес к его прозе современных читателей и исследователей.

## Литература


1. *Лавкрафт, Г. Ф.* Сверхъестественный ужас в литературе [Электронный ресурс] / Г. Ф. Лавкрафт // Библиотека «Lib.ru». – Режим доступа:http://lib.ru/INOFANT/LAWKRAFT/sverhestestvennyj_uzhas_v_literature.txt_withbig-pictures.html.– Дата доступа: 15.09.2022.
2. *Лавкрафт, Г. Ф.* Дагон [Электронный ресурс] / Г. Ф. Лавкрафт // Электронная онлайн библиотека «Booksonline». – Режим доступа: https://booksonline.com.ua/view.php?book=168203.– Дата доступа: 15.09.2022.



*С. А. Сычова (Беларусь)*


# АСЭНСАВАННЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ У «ЛІСТКАХ КАЛЕНДАРА» МАКСІМА ТАНКА

Максім Танк быў сведкам падзей цэлай эпохі, часу карэнных змен у жыцці, свядомасці. Успрыманне падзей, сваю ацэнку ім ён дае ў дзённіках. Святлана Уладзіміраўна Калядка напісала так: ««Лісткі календара» ахопліваюць перыяд з 1935 па 1939 г. Гэта вельмі важныя гады ў фарміраванні асобы Яўгена Іванавіча Скурко і творчай індывідуальнасці Максіма Танка. Менавіта віленскі перыяд у жыцці паэта пакінуў такую супярэчлівую колькасць падзей, што гэтага ўсяго хапіла б на некалькі чалавек» [1, с. 5].

Калі чытаеш своесаблівы дзённік, то ўражвае ахоп праўя жыцця, адначасова не пакідае адчуванне, што аўтар пісаў з пэўнай асцярогай. Пра гэта сведчыць некаторая недасказанасць, мінімальная ацэнка падзей. Мы бачым Максіма Танка як асобу, якая разважае над жыццём.

Аўтар адчувае сябе часткай народа, апісвае свае звычайныя вясковыя справы. Яўген Іванавіч спадзяецца, што «набліжаецца час, калі кніга перастане быць адзіным пасланцом культуры. Але ў нас яшчэ і кніга з'яўляецца рэдкім госцем у сялянскай хаце. Найчасцей гэтай кнігай бывае каляндар. Прызнацца, з яго пачалася мая нацыянальная свядомасць» [1, с. 31].

Асаблівасць існавання беларускага народа адчуваецца ва ўспрыняцці яго прадстаўнікамі іншых краін. Вясковыя людзі жывуць сваім жыццём, яны існуюць, нібы ў іншым вымярэнні. Гэта можна растлумачыць і адсутнасцю развітай камунікацыі, і неабходнасцю выжыць у складаных умовах. «Шмат каму наш куток здаецца глухім. І сапраўды, да нас са спазненнем даходзяць весткі з шырокага свету, а некаторыя – і зусім не даходзяць. Ды, працуючы на зямлі, і сам пачынаеш думаць, што няма больш важных вестак, як аб пагодзе і ўраджаі, і імі пачынаеш даражыць найбольш. Нават чалавечае жыццё – не тое вечнае, як яны» [1, с. 101].

А пагаршэнне эканамічнага становішча простага чалавека асэнсоўваецца праз падзеі і размовы на кірмашы. Так, аўтару знаёмы мядзельскі гандляр «скардзіўся, што сяляне амаль нічога не купляюць. Безграшоўе страшнае. Ашчаджаюць на солі, на газе, на запалках» [1, с. 113]. Максім Танк прыводзіў прыклады і з уласнага жыцця: «А ў магазінах поўна розных прадуктаў. Толькі заўважыў, пакупнікоў менш, як гледачоў, якія доўга, як і я стаялі і прыглядаліся да цэн: масла кілаграм – тры злотых 50 грошаў, свініна – 1 злоты 17 грошаў, бараніна – 80 грошай, яйкі…

Кожны з нас рабіў выгляд, што хацеў нешта купіць і толькі не мог адразу выбраць…» [1, с. 215]. На гэтых прыкладах з розных гадоў бачна, што народ жыў бедна. Варта адзначыць, што на працягу гэтага часу аўтар неаднаразова піша пра тое, што не было грошай як у яго, так і ў іншых, і людзі вымушаны былі эканоміць на самым неабходным.

Адносіны беларусаў да веры займаюць асобнае месца ў асэнсаванні светапогляду народа. Максім Танк распавядае, што сяляне «расказвалі і смяяліся, як Базыль, хаваючы свайго сына, таргаваўся з папом. Духоўны айцец за два злотых не хацеў ісці на магільнік маліцца, патрабаваў, каб Базыль яшчэ тры дні яму пакасіў сена. І толькі тады згадзіўся, калі той напалохаў яго, што пойдзе да ксянза ці рабіна. Бо мёртваму – усё роўна, хто яго будзе хаваць» [1, с. 187]. Аналагічныя вобразы мы сустракаем і ў літаратурных творах. Так адлюстроўваецца своеасаблівая набажнасць народа, для якога сам факт больш важны, чым дакладнае следаванне канонам.

Беларусы станавіліся менш адданымі веры. Пра што сведчылі і скаргі войта, «што разагітаваныя камуністамі сяляне не выходзяць на шараварачныя работы. Крывіцкі ксёнз і той зняверыўся ў сваіх парафіянах, якія перастаюць хадзіць у касцёл і чытаюць падпольныя лістоўкі» [1, с. 214]. Варта адзначыць, што гэты працэс звязваўся таксама і з пратэстам супроць існуючага парадку. Аднак сутнасць існавання чалавека на зямлі звязвалася і звязваецца з працай на ёй. Зямля выступае як аснова жыццядзейнасці. Менавіта таму «старому

цяжка было ўявіць, што нехта мог прапіць зямлю, якую ён усёй сваёй сялянскай істотай любіў і паважаў больш, як самога бога» [1, с. 224]. Гэтымі словамі выяўлена аснова духу беларусаў.

Безумоўна, значнае месца ў запісах займае літаратурная творчасць, развагі над развіццём літаратуры, сваім бачаннем паэзіі. Вялікай перашкодай на шляху ўсталявання нацыянальнай літаратуры з'явілася «амаль поўная ліквідацыя беларускіх друкаваных органаў, выдавецтваў, непераадольныя цэнзурныя рагаткі», якія «не даюць магчымасці нашаму голасу прабіцца ў свет» [1, с. 36]. І гэта адбываецца ў час, калі ў «нас літаратуры прыдаецца велізарнейшае значэнне, якога яна ў іншых народаў не мае. Не знаходзячы ў сённяшнім жыцці справядлівасці, народ шукае ў літаратуры адказы на ўсе пытанні, якія яго хвалююць і непакояць. У нас няма розніцы паміж літаратурай і адозвай, літаратурай і забастоўкай, літаратурай і дэманстрацыяй, таму амаль ва ўсіх палітычных працэсах разам з барацьбітамі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне на лаве падсудных знаходзілася наша заходнебеларуская літаратура» [1, с. 48]. Аўтар дае ацэнку таму, як літаратура развіваецца на тэрыторыі щсходняй Беларусі, захапляецца ёй: «Якая ў Савецкай Беларусі расце вялікая і сапраўдная літаратура!» [1, с. 50].

Аналізуючы і разважаючы пра асаблівасці беларускай паэзіі, аўтар падкрэслівае яе сувязь з жыццём, настроямі ў грамадстве. «Паэзія наша – цяжкая, як камень, вырваны з бруку падчас вулічных баёў, немілагучная – як стогн ці крык, чырвоная – як пралітая кроў. Іншая яна сёння і не можа быць» [1, с. 55]; «наша паэзія, звязаная з вызваленчай барацьбой народа, здаецца крыху архаічнай. Для іх гэта – пройдзены этап. У нас жа і любоўная лірыка не існуе ў чыстым выглядзе» [1, с. 91].

Гэта Максім Танк тлумачыць наступным чынам: «Народ можа дараваць пісьменнікам многае, але не можа дараваць маўчання ў часы, калі вырашаецца яго лёс» [1, с. 63].

Разважае паэт і над агульнымі пытаннямі развіцця беларускай літаратуры, яе месцам сярод іншых літаратур, вылучае тыя праблемы, якія існуюць, але якія неабходна вырашыць дзеля будучыні. «Спазненне – нацыянальная наша хвароба. А праз сутнасць сваіх школ яна стала хранічнай. Псіхіка маладога пакалення па-за фальклорам і некаторымі жывучымі яшчэ традыцыямі фарміруецца пад уплывам чужой літаратуры, чужога мастацтва» [1, с. 139].

Варта адзначыць розныя падыходы да ацэнкі літаратурных твораў. Вядома, што цэнтральным вобразам беларускай літаратуры быў мужык. Адпаведна «сярод нашых снобаў бытуе тэорыя двух гатункаў мастацтва: адно – для іх, другое, «ніжэйшае», – для іншых. Толькі гэта «для іншых» заўсёды аказвалася чартоўскі жывучым і найбольш даўгавечным» [1, с. 157]. Сам Максім Танк пісаў: «Цяпер асцярожней стараюся падыходзіць да ацэнкі, бо гісторыя літаратуры і мастацтва гаворыць, што асуджаныя часта перажывалі сваіх суддзяў і іх трыбуналы» [1, с. 271].

Разважаючы над неабходнымі ўмовамі існавання літаратуры, асэнсоўваючы тое, што варта зрабіць, Максім Танк піша: «Усё больш пераконваюся, што

для папулярызацыі таго ці іншага паэта, ці нават цэлай літаратуры, патрэбна адпаведная званіца. Званіца гэтая – дзяржаўнасць і тое месца на зямлі, якое займае народ і яго мова. А наш голас усё яшчэ не вырваўся нават на волю з падвалаў астрожных карцэраў» [1, с. 247]. Пры гэтым заўважае, што на тэрыторыі Савецкай Беларусі літаратура развіваецца, а ў «Польшчы, як ні дзіва, не зважаючы на антыўсходнюю палітыку ўрада, шмат выдаецца кніг савецкіх пісьменнікаў. Відаць, гэта – прыбыльная справа» [1, с. 296].

Асаблівасцю беларускай культуры было тое, што «амаль усе мы – прадстаўнікі першага пакалення беларускай інтэлігенцыі, якая выйшла з сялянскага асяроддзя. Нават гарадская вопратка, у якой чуемся скутымі, не ў сілах адмяніць наш мужыцкі выгляд. Мы ўсюды выдзяляемся сваімі абветранымі далонямі, плячыстасцю і гутаркай ва ўвесь голас, быццам мы заўсёды знаходзімся ў полі ці лесе» [1, с. 55]. З гэтай акалічнасці вынікала наступная праблема: «Многія з нашых бунтарных паэтаў саромеюцца прызнацца ў любові да свайго роднага кутка, да сваёй хаты, сям'і, каб не палічылі іх абмежаванымі» [1, с. 265]. Можна сцвярджаць, што Максім Танк, гаворачы пра літаратурныя праблемы, акрэсліў і праблемы свядомасныя, якія выявіў у сваім апавяданні Максім Гарэцкі «На каляды к сыну». Здаецца, адсутнасць падобнага. Аднак размова ідзе пра вырачэнне ад свайго роднага, ад сваёй прыналежнасці да самай вялікай часткі народа.

Максім Танк разумеў, наколькі адносіны да свайго, народнага залежаць ад школьнай адукацыі. Ён адзначае, што да гэтага пытання з асаблівай увагай ставіцца і ўрад. «На з'ездзе польскіх настаўнікаў у Вільні дырэктар семінарыі Матушэвіч сказаў, што рэгулярнае наведванне дзецьмі школы тут, на Паўночна-Усходніх землях, не з'яўляецца пытаннем школьнага характару, а, наадварот, пытаннем грамадска-палітычнага значэння» [1, с. 71]. Адчуваецца разуменне дзяржавай важнасці школьнай адукацыі ў патрэбным накірунку. Праз некалькі год, а дакладна ў 1938 годзе, Максім Танк «перапісаў з газеты ў блакнот […] гістарычныя словы пана міністра асветы Скульскага: «Запэўніваю вас, што праз дзесяць год у Польшчы нават са свечкай не знойдзеце ніводнага беларуса…» [1, с. 199]. Такім чынам міністр вызначыў накірунак школьнай адукацыі на бліжэйшыя гады.

Аўтар «Лісткоў календара» на адкрыцці помніка на магіле Казіміра Сваяка сустрэў некалькіх знаёмых гімназістаў, якія расказалі яму, што іх «выклікаў дырэктар Р. Астроўскі і забараніў ім сустракацца са мной, як чалавекам, які сядзеў за камуну, а зараз знаходзіцца над наглядам паліцыі і г. д.; таксама забараніў ім заходзіць у рэдакцыю газеты «Наша воля» і ў Таварыства беларускай школы…» [1, с. 113]. Як на тэрыторыі Заходняй Беларусі, так і ў Літве польскі ўрад прыступіў да ліквідацыі ўсіх культурна-асветніцкіх арганізацый [1, с. 104]. Такім чынам урад знішчаў усё, што магло захаваць нацыянальную ідэнтычнасць жыхароў у шматнацыянальнай дзяржаве. Яны павінны былі адчуваць сябе маналітнай структурай.

Адначасова падзеі ў суседніх дзяржавах прымушалі бачыць і адваротны бок жыцця. «За гады існавання панскай Польшчы вырасла пакаленне, атручанае

вялікадзяржаўным, каталіцкім і шавіністычным духам. І яно, апроч «польскай нацыі», не бачыла нічога. Толькі трагічныя падзеі ў самой Польшчы, у Германіі, у Іспаніі змусілі многіх задумацца і зрабіць пераацэнкі ўсяму, чаму вучылі, і больш цвяроза пaглядзець на рэчаіснасць, на жыццё» [ 1, с. 204].

Варта адзначыць, што людзі змагаліся за школы, за магчымасць атрымліваць адукацыю. «Прынёс Кастусю ад С. Паўловіча копію мемарыялаў аб школьным пытанні ў Заходняй Беларусі. Першы варыянт быў значна мацнейшы. Выпалі многія жахлівыя факты, звязаныя з ліквідацыяй беларускіх школ, бібліятэк, гурткоў, культурна-асветных арганізацый, газет, часопісаў. Адным словам – адрэдагавалі…» [1, с. 193].

Максім Танк піша пра сваё жыццё ў Заходняй Беларусі. Безумоўна, значнае месца ва ўспамінах пакінуў суд. Юнаку быў вынесены прысуд: «Заклікаў да выступленняў супраць існуючага ўрада і за адрыў ад Польскай дзяржавы часткі яе тэрыторыі». Апошняя фармуліроўка была заключным абзацам ва ўсіх палітычных актах абвінавачання, стаўшы трафарэтнай і ўсім вядомай: «Усё абвінавачанне трымалася на паказаннях стражнікаў» [1, с. 37].

Паэт расказвае пра суды: «нашаму брату [палітычным] даставалася больш, як усім арыштантам», а насельніцтва, наадварот, спачувала: «успомніў сваё падобнае «падарожжа пад экскортам» з Глыбокага ў Вільню вясной 1933 года. Толькі ехаў я тады ў перапоўненым пасажырскім вагоне, і, як паліцэйскія ні стараліся мяне ізаляваць, многія, даведаўшыся, што я – палітычны арыштаваны, прапанавалі мне свае папяросы і хлеб» [1, с. 101].

Ён разважае над сітуацыяй у краіне: «Сёння Заходняя Беларусь – мяшок, завязаны паліцэйскім бізуном, ксянзоўскім ружанцам і пятлёй пана Маціеўскага, дзе з-за адсутнасці свежага паветра пачынае гаснуць усякае святло – нават лучына» [1, с. 50]. Аднак «яны забываюць, што і маўчанне можа быць пратэстам, што на свеце ёсць дзве праўды: праўда прыгнечанай нацыі і пануючай. Першая – у мільён раз большая. І яе нічым не заб’еш» [1, с. 36].

Дзяржава мае два твары: адзін – ноччу, другі – днём. «Вясёлая ў нас дзяржава. Ноччу толькі чуваць: «Рэж, лаві, бі!», а днём злачынцы ідуць пад Вострую Браму маліцца» [1, с. 170]. Калі ўяўляеш гэту карціну, то ўзгадваеш падзеі, якія прывялі да з’яўлення вучэння Лютэра, што выступіў супроць індульгенцый.

А таксама існавала частка насельніцтва, якая не ведала пра падзеі ў краіне. «Некаторыя з іх – з палітычных працэсаў і скупых звестак аб пацыфікацыях – упершыню даведаліся, што пад адной страхой з імі, толькі за закратаванымі вокнамі, жывуць мільёны людзей іншых нацыянальнасцей – людзей, пазбаўленых усіх чалавечых правоў…» [1, с. 204]. Гэта было ў той драматычны час, калі «на арэне гісторыі вырашаецца не лёс адзінак, не паасобных герояў, а цэлых народаў» [1, с. 38].

Максім Танк апісвае страту сваіх сяброў, паплечнікаў, проста знаёмых людзей. Вельмі ўразіла смерць Трахіма [Буткевіча]. Паэт быў перакананы ў стойкасці гэтага чалавека. «У тое, што самагубствам канчаюць толькі слабыя людзі, я не веру. Не веру і ў тое, што ён зламаўся, бо ніхто, каго ён знаў – а знаў

ён многіх людзей, – не быў арыштаваны. А можа яго павесілі?» [1, с. 194]. Такім чынам адлюстравана і прыкмета стойкасці чалавека. Пасля яго смерці – нікога не арыштавалі!

Аўтар звяртае ўвагу і на палітычную сітуацыю ў свеце: «Чуваць, некаторыя ўрадавыя кругі пачынаюць заігрываць з нацыянальнымі меншасцямі, даказваючы, што польскі нацыяналізм ніколі не адносіўся варожа да літоўцаў і беларусаў» [1, с. 253]; «ясна адно: вайна не за гарамі. Толькі наш гаспадар ды яму падобныя могуць думаць, што Гітлера ўдасца спыніць нейкімі прамовамі» [1, с. 262].

Знойдзем і развагі над падзеямі ў глабальным плане. Напрыклад, аналізуючы дзеянні польскага кіраўніцтва, Максім Танк прыходзіць да высновы, што «заўсёды тыя, у каго няма аргументаў, адказваюць кулямі, арыштамі, цэнзурнымі забаронамі» [1, с. 65].

Падзеі грамадска-палітычныя перамяжоўваюцца з развагамі аб жыцці. Аўтар адзначае, што «самыя самотныя на магільніку – магілы славутых. Ад іх велічных помнікаў вее забыццём і адзіноцтвам. Аб іх успамінаюць толькі ў юбілейныя дні» [1, с. 169]. Гэтая думка настолькі нечаканая і праўдзівая, што прымушае задумацца над сутнасцю чалавечага існавання. Асаблівае значэнне набывала адчуванне і разуменне сваёй еднасці з родным кутком, народам, таму што «з кожным днём становіцца ўсё больш складана разабрацца ў людзях. Раней на кожным была свая бірка: партыйная, класавая, нацыянальная. Ідзеш па вуліцы і здалёк бачна, з кім размінаешся. А зараз, перад абліччам небяспекі вайны і фашызму, шукаем людзей сумленных, гатовых стаць з намі поплеч. І трэба прызнацца, што іх удаецца знаходзіць там, дзе раней і не спадзяваліся іх знайсці» [1, с. 195].

Паступова ў апавяданні пра падзеі ўсё часцей узгадваецца вайна, яе набліжэнне. «Усё больш пахне порахам… Толькі ўрадавыя газеты маўчаць. Тым, хто мог бы ўдарыць у набат, звязалі рукі; тым, хто мог сваім голасам папярэдзіць аб небяспецы, закрылі рот; тыя, хто павінен быў узначаліць барацьбу супроць фашызму, абяззброены» [1, с. 271]. Прадчуванне катастрофы паглыбляла наяўнасць вялікай колькасці плакатаў, якія заклікалі да абароны, гатоўнасці змагацца, а гэта значыць, што небяспека вайны зусім набліжалася да нас… І прадчуванні не падманулі. «Учора пачалася вайна…. Мне здаецца, што гэта вайна павінна перайсці ў вайну супроць фашызму, і не толькі нямецкага» [1, с. 321].

Варта адзначыць, што вестку пра тое, што «Чырвоная Армія перайшла граніцу і ідзе вызваляць Заходнюю Беларусь…» [1, с. 326], сустрэў з радасцю. Максім Танк перажываў, што сустрэў такую падзею непадрыхтаваным, думаў аб неабходнасці распрацоўкі новых тэм у паэзіі.

Змянілася жыццё, па-іншаму сталі паводзіць сябе людзі. «Каго толькі не сустрэнеш, у гэтым горадзе! У перапоўненых рэстаранах сядзяць былыя абшарнікі, урадоўцы, пераапранутыя ў цывільную вопратку паліцэйскія і ваенныя – п’юць дзень і ноч, быццам спраўляюць хаўтуры па былым жыцці, па сваіх маёнтках і надзеях» [1, с. 333].

Разам з тым, «агулам адчуваецца нейкая насцярожанасць да былых членаў КПЗБ. Многія з маіх сяброў нават ужо не прызнаюцца, што яны некалі бралі актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху, бо зараз асабліва цэняць тых, хто да самага вызвалення сядзеў дома. Ледзь не са свечкай шукаюць падобных «дзеячаў»« [1, с. 334].

Самай значнай падзеяй, да якой імкнуўся ўсёй душой, стала сесія Вярхоўнага Савета (03.12.1939), якая «прыняла закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Гэтай векапомнай падзеі ўжо нікому і ніколі не выкрасліць з нашай гісторыі. Гераічная барацьба беларускага народа знайшла сваё канчатковае і слаўнае завяршэнне» [1, с. 339]. Можна сказаць, што аўтар падводзіць вынікі гэтага перыяду свайго жыцця.

А заканчваецца аповед словамі: «На сцяне вісіць нядаўна куплены каляндар, на якім, апроч даты, даўжыні дня, гадзін усходу і заходу сонца, напісана, колькі год Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая пераможна крочыць па ўсёй зямлі» [1, с. 352].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што «Лісткі календара» Максіма Танка з'яўляюцца летапісам яго жыцця ў 1935–1939 гг. Паэт асэнсаваў палітычныя, культурныя, сацыяльныя бакі не толькі свайго жыцця, але і ўсяго народа ў гэты складаны перыяд.

## Літаратура

1. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 9 : Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 2009. – 592 с.

*Г. А. Талочка, Д. М. Чаранкевіч (Беларусь)*

# МАТЭРЫЯЛЫ ДА «БЕЛАРУСКА-РУСКАГА ВІЗУАЛЬНАГА СЛОЎНІКА НЕАФІЦЫЙНЫХ МІКРАТАПОНІМАЎ ГОРАДА МІНСКА»

Найменні ўнутрыгарадскіх аб'ектаў складаюць своеасаблівую і вельмі складаную сістэму. З іх ліку вылучаюцца канатацыйныя ўрбанонімы, якія прыцягваюць увагу сваёй рухомасцю, экспрэсіўнасцю, якія жыва рэагуюць на падзеі горада, у якіх адлюстроўваюцца не толькі палітычныя, сацыяльныя і іншыя погляды грамадства, а і пэўныя моўныя тэндэнцыі, асаблівасці словаўтварэння, словазмянення.

Мэта стварэння такіх найменняў – даць больш кароткую намінацыю ў адпаведнасці з адным з асноўных прынцыпаў функцыянавання мовы – прынцыпам эканоміі.